# Навука добрых нораваў

**В.С.Болбас**, *кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры педагогікі Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута*

## Сімяон Полацкі аб маральным выхаванні

Вырашэнне задач маральна-духоўнага адраджэння беларускай нацыі ставіць перад педагагічнай навукай і практыкай шэраг сур'ёзных праблем і пытанняў: якая мэта маральнага выхавання? Чым напоўніць яго змест? Якімі шляхамі можна дасягнуць маральнага ўдасканалення грамадства?

Каб знайсці адказы, варта звярнуцца да шматвяковага выхаваўчага вопыту нашага народа, абагульненага яго знакамітымі прадстаўнікамі, якія пакінулі нам неацэнны скарб — айчынную педагагічную спадчыну. Адным з такіх слаўных сыноў Бацькаўшчыны з'яўляецца слынны ўсходнеславянскі мысліцель, філосаф, паэт, педагог і кнігадрукар Сімяон Полацкі.

Сімяон Полацкі (1629—1680), свецкае імя якога было Самуіл Гаўрылавіч Пятроўскі-Сітніяновіч, нарадзіўся ў Полацку ў сям'і заможнага шляхціца. Потым хлапчука выхоўваў айчым, які і даў яму другое прозвішча — Пятроўскі. Атрымаўшы выдатную для свайго часу адукацыю, будучы чалавекам вельмі таленавітым, Самуіл пастрыгся ў манахі дзеля таго, каб прысвяціць жыццё навуковай і асветніцкай дзейнасці. Хутка на гэтай ніве дасягнуў такіх поспехаў, што яго запрасілі з Беларусі да царскага двара ў Маскву, дзе быў настаўнікам і выхавальнікам царскіх дзяцей. Адначасова вучыў грамаце пад'ячых з Прыказа тайных спраў. Займаўся рознабаковай грамадскай, рэлігійнай, навуковай, літаратурнай і выдавецкай дзейнасцю. З'яўляючыся адным з аўтараў праекта славутай Славяна-грэка-лацінскай акадэміі, ён лічыў, што ад усіх няшчасцяў на зямлі можна пазбавіцца шляхам адукацыі і выхавання людзей.

Вялікі беларуска-рускі мысліцель у многіх кірунках сваёй шматграннай дзейнасці быў у ліку заснавальнікаў і першапраходцаў. Аб яго жыцці і дзейнасці напісаны дзесяткі навуковых прац, выдадзена шмат кніг. Хацелася б засярodзіць увагу на адным з найменш даследаваных бакоў яго педагагічнай спадчыны — мараль-

на-выхаваўчых ідэях. Нягледзячы на тое што асноўны перыяд свядомага жыцця вучонага праходзіў у Маскве, яго творчы патэнцыял, філасофска-педагагічныя і сацыяльныя погляды грунтаваліся на айчынным падмурку і шмат у чым сінтэзавалі і абагульнялі падыходы беларускіх асветнікаў XVI—XVII стст., у тым ліку і па пытаннях маральнага выхавання падрастаючых пакаленняў.

Большую частку свайго жыцця С. Полацкі прысвяціў настаўніцкай дзейнасці — спачатку на Беларусі, у брацкім вучылішчы Полацкага Багаяўленскага манастыра, а затым — у Маскве, у школе Заіканаспаскага манастыра. Калі быў хатнім настаўнікам царскіх дзяцей, спецыяльна для малалетняга Пятра I стварыў буквар. Як вядома, тагачасны буквар не проста быў падручнікам для навучання чытанню, а змяшчаў мноства навучальнага матэрыялу — г.зн. быў сродкам для выхавання грамадзянскіх пачуццяў і маральных правілаў. С.Полацкі пакінуў пасля сябе мноства літаратурных і навуковых твораў, якія не толькі з'яўляюцца унікальнымі пісьмовымі помнікамі культуры, але і выклікаюць цікавасць з пазнавальнага пункту гледжання. Многія погляды мысліцеля засталіся актуальнымі і ў нашы дні.

Сёння асаблівую цікавасць уяўляе той час у жыцці вялікай дзяржавы, які быў рубяжом пераходу Расіі ад старой сярэдневяковай Русі да Расійскай імперыі. Гэта быў перыяд, калі Расія нібы рыхтавалася да гіганцкага рыўка пятроўскіх часоў. "Руская дзяржава была пастаўлена перад неабходнасцю прызнаць народную адукацыю адной з самых сваіх надзённых задач, наблізіць яе да ўзроўню заходнееўрапейскай" [5, *216*], — сцвярджаюць даследчыкі Дз. Жукаў і Л. Пушкароў. Думка, як бачым, сугучная з днём сённяшнім і для Беларусі.

Дапамагаючы людзям уразумець сэнс іх жыццёвага шляху, Сімяон Полацкі ўказваў, што шчасце чалавека схавана ў яго ўласных дабрачыннасцях, якімі кожны павінен пастаянна ўзбагачацца. "Добродетелми богат быти тщися, паче сокровищ теми прославися" [6, *248*], — заключаў асветнік. Ён папярэджваў, што набыццё маральных якасцей значна каштоўней за любыя матэрыяльныя скарбы, нават царскія. Вось чаму пры выхаванні дзяцей настойліва раіў "прежде обогатить их благонравием и благочестием" [1, *347*].

Іераманах не пагаджаўся з поглядамі сярэднявечча на зямны перыяд жыцця чалавека як на нешта другараднае, што амаль не ўяўляе ніякай каштоўнасці. Наадварот, час зямнога існавання ён лічыў найвялікшым скарбам, якім кожны павінен беражліва распарадзіцца: "Злато погубленное может ся, нажити, время ж протекша несть лет возвратити" [6, *262*].

Адкрытую варожасць у іерархаў Маскоўскай царквы выклікалі разважанні Сімяона аб зямным шчасці як мэце чалавечага жыцця. У адной са сваіх пропаведзяў ён пісаў: "Кого ради солнце день творит, луна со звездами тму нощную озаряет? Ради человека. Кого ради сокровища злата и серебра, и каменей честных в недрах земных, и бисеры драгия в пучинах водных соблюдаются? Человека для. Паче же и ангелы, честнейши естеством от человека, человеку на службу богом установившися, по свидетельству язык учителя..." [9, 13 адв].

С. Полацкі ўказваў на велізарныя магчымасці выхавання ў фармаванні прыстойнай асобы. Погляды вучонага грунтаваліся на шматвяковым выхаваўчым вопыце наро-

да, увабралі дасягненні айчыннай і замежнай педагагічнай думкі, таму на даволі высокім узроўні тэарэтычнага абагульнення ён вызначаў : “Аще не родом, но весма с науки добронравие идет от рук в руки” [8, *294*]. Як падкрэсліваюць даследчыкі, С. Полацкі амаль на 20 гадоў раней, чым англійскі філосаф-педагог Дж. Лок, прыйшоў да высновы аб адсутнасці ў чалавека прыроджаных ідэй, у тым ліку і маральных. З гэтай нагоды ён пісаў: “...Философ умы отрок юных уподобляет скрижали ненаписанней, на ней же учитель что-либо хощет написати может: точие во умех юношеских, что-либо хощеши вообразится, или добро, или зло, и выну пребывает и прибывает” [6, *262*].

Адвяргаючы галоўную ролю прыроджаных якасцей у развіцці асобы, ён крытыкаваў астралагічныя погляды аб наканаванасці лёсу чалавека ў залежнасці ад зоркі, пад якой нарадзіўся, хаця згаджаўся з уплывам нябесных свяціл на характар індывіда. На яго думку, усё залежыць ад выхавання, якое дзіця атрымала.

Важкі след у фармаванні айчыннай этыка-педагагічнай думкі пакінулі ідэі С. Полацкага аб глыбокай і ўдумлівай распрацоўцы маральна-выхаваўчых мэт. Актуальныя і сёння яго разважанні аб тым, што калі пачынаеш штосьці рабіць, у тым ліку і ў сферы маральнага выхавання, то трэба зараней прадбачыць той вынік, да якога хочаш прыйсці: “Егда хощеши дело начинати, конец первее требе разсуждати” [6, *260*]. Вось чаму педагог-філосаф неаднаразова падкрэсліваў, што галоўнай выхаваўчай мэтай павінна быць фармаванне дабрадзейнасці, якая цалкам вызначае духоўны свет індывіда. Уся маральна-выхаваўчая спадчына асветніка — гэта сапраўдны апафеоз “добронравию, яко без оного аки тело без души есть” [5, *223*].

Як і яго папярэднікі, С. Полацкі спрабаваў распрацаваць адзіныя для ўсіх слаёў і класаў грамадства падыходы ў маральным выхаванні, якія б грунтаваліся на маральных законах і нормах і якімі павінны былі карыстацца ў жыцці ўсе без выключэння людзі. Трэба адзначыць, што езуіты ператлумачвалі біблейскія запаветы такім чынам, што, паводле іх, асобы, якія займалі больш высокае становішча ў грамадстве, карысталіся адпаведна большымі правамі. У С. Полацкага ж перад законамі маральнасці роўныя і цар, і жабрак. Таму ён лічыў, што ў грамадстве неабходна “во-первых, нравы благо устрояти” [6, *260*].

Адзначаны вышэй дэмакратызм беларускага гуманіста не мог не паўплываць на характар мэт маральнага выхавання, якія ён распрацоўваў. Маральна дасканалы чалавек у яго разуменні — гэта прыхільнік простых людзей, іх абаронца і дарадчык. Сімяон пастаянна прапаведваў любоў да абяздоленых, убогіх. Важна адзначыць, што ім ставілася мэта не толькі прывіць пачуццё спачування да простых людзей, але і паказаць веліч, мудрасць, гераізм апошніх. Паводле пераканання іераманаха, нават цар можа быць абраны з нязнатнага роду.

Слынны мысліцель як бы абагульняў падыходы айчынных педагогаў аб увядзенні ў мэтавыя ўстаноўкі маральнага выхавання абшчыннай, таварыскай арыентацыі. Ён неаднаразова падкрэсліваў, што чалавек — істота “*содружная*”. Сімяон павучаў, што калі замест “*твое*” і “*мое*” людзі часцей бы гаварылі “*наше*”, то вельмі многае ў гэтым свеце змянілася б да лепшага. “Мое и твое, речь да упразднится, — пісаў С. Полацкі, —

вместо же тое НАШЕ да слышится. Тогда желанный мир во мире будет" [6, *237*]. Нават калі чалавек сваімі ведамі, мудрасцю не дзеліцца з акружаючымі, а ўтойвае іх у сабе, то ён прыпадабняецца да бязглуздага, які закопвае ў зямлю "*чыстае золата*".

У той жа час асветнік услаўляў і кожнага індывіда, яго магчымасці і здольнасці. Чалавек, у яго разуменні, актыўная істота, якая ў імкненні да агульнага дабра павінна паляпшаць і свой дабрабыт. Такім чынам даволі прагрэсіўна для свайго часу ім вырашалася пытанне сінтэзу інтарэсаў грамадства і асобы. І ўсё ж перакананы прыхільнік і дбайны захавальнік хрысціянскай веры арыентаваў, што павінен "человек ... своих не чюждых трудов плодом жити" [6, *242*].

Зыходзячы з такіх мэтавых накірункаў маральнага выхавання, у поўнай адпаведнасці з хрысціянскім веравучэннем, С. Полацкі, гэтак жа, як і Ф. Скарына і яго паслядоўнікі, галоўным лічыў выхаванне ў дзяцей пачуцця любві — любві да бліжняга, да чалавека наогул, да навакольнага асяроддзя, да прыроды, да жыцця. Любоў у Сімяона настолькі ўсеабдымная, што яна не мае межаў: "Великая добродетель есть любовь. Любовь долготерпит, не завидует, не превозносится, не гордится, не бесчинствует, не раздражается, не мыслит зла, не радуется неправде, а радуется истине... Любовь выше веры и надежд" [1, *341*].

Чалавекалюбства дапамагае развіццю ў чалавека такіх рыс, як таварыскасць, дружалюбнасць, імкненне да згуртаванасці. С. Полацкі цвёрда прытрымліваўся арыстоцелеўскай трактоўкі чалавека як "*жывёліны грамадскай*". Ён амаль паўтараў словы антычнага філосафа і пісаў: "...Понеже человек несть зверь дивный, но содружный, — отусюду же градове и села вину насаждения прияша, да во содружестве жительствующие взаим помощ нам деем и купно создавшего ны о всяческих его благотворениих славословим" [6, *238*]. Абапіраючыся на старажытную легенду, ён пісаў, што людзей "яко и стрел, во едином скопце сущих, никто же сломати доволен. Тые ж де, паки по единой разлученные, и малая ломит сила" [6, *264*].

С. Полацкі запэўніваў, што вянцом маральнасці чалавека, упрыгожаннем яго духоўнага свету з'яўляецца праўдзівасць, сумленнасць. Пры пералічэнні ў адным са сваіх вершаў самых магутных рэчаў у свеце ён на першае месца ставіў праўду. "Жыццё, прыгажосць, гонар служаць ёй" [8, *116*], — пісаў мысліцель. Выхаванцам сваім ён даваў такую параду: "Слово праведно тщися глаголати, лживаго паки никогда вещати" [6, *250*].

Выключна важным лічыў С. Полацкі выхаванне працалюбства. "Да обучают дети своя или рукоделию некоему или иному честному коему упражнению" [12, *175*], — раіў педагог. У марнатраўстве ён бачыў крыніцу многіх зол і распусты. Бяздзейнасць, па яго перакананні, вядзе да маральнага ўбоства, духоўнай дэградацыі асобы. С. Полацкі рэкамендаваў "берагчыся ад гультайства, бо то есць маці прывыкання да зла" [8, *119*]. Таму досыць катэгарычна гучыць яго настаўленне: "У штодзённай рабоце як муравей будзь" [8, *98*]. Нават цар павінен умець выконваць любую работу і быць прыкладам у працалюбстве для падначаленых.

Маральна дасканаламу чалавеку, на думку С.Полацкага, абавязкова павінны быць уласцівы такія якасці,

як памяркоўнасць, разважлівасць. "Кто не умеет временно молчати, не научится добре глаголати" [8, *371*],— настаўляў педагог сваіх выхаванцаў. Па яго меркаванні, пачуццё меры садзейнічае ўзвышэнню чалавека сярод акружаючых, дапамагае яму ў маральным развіцці. Хаця на фармаванне гэтай якасці значны ўплыў аказвалі пастулаты хрысціянскай этыкі, рэальныя зямныя матывы ў ёй усё больш бралі верх. Так, С.Полацкі, будучы перакананым пабарнікам строгага рэлігійнага спосабу жыцця, тым не менш папярэджваў заўзятых выканаўцаў культавых абрадаў, што пачуццё меры павінна быць і тут. "Воздержание аще безмерно храниши, множицею души ти вред великий твориши, — павучаў ён, — уне есть мерно по вся дни вкушати, нежели долго от пищ ся держати: пост бо безмерный силу истребляет, дух уныния и печаль раждает" [6, *243*].

Важнай лічыў асветнік і такую якасць, як самакрытычнасць — яна дапамагае даць правільную самаацэнку і дакладней скіраваць чалавека ў арганізацыі маральнага самаўдасканалення. Вось чаму ён папярэджваў, што "аще кто чинно грех твой обличает, не враг ти, но друг. Блага ти желает" [6, *249*].

Накіраванасць маральных якасцей на паляпшэнне рэальнага, зямнога жыцця абумовіла неабходнасць увядзення ў змест маральнага выхавання такіх якасцей, як смеласць, храбрасць і мужнасць. Важна, што С. Полацкім яны трактуюцца не толькі як неабходныя ў нейкіх надзвычайных абставінах, але і як патрэбныя ў паўсядзённым жыцці. Самому Сімяону не раз даводзілася сутыкацца з гэтым пры адстойванні ўласных поглядаў, прытрымліванні пэўнай грамадскай пазіцыі. Асабліва адчуў гэта асветнік пры пераездзе ў Маскву, бо, як ён пісаў , "...толпа нетерпима к разномыслящим с нею" [12, *115*].

С. Полацкі вялікую ўвагу ўдзяляў паказу не толькі станоўчых, але і адмоўных, амаральных рыс і якасцей, якія ўласцівы асобным людзям. Да адной з самых распаўсюджаных ён адносіў срэбралюбства і перасцерагаў, што гэтая якасць валодае магутнай разбуральнай сілай, здольнай развіць у чалавека мноства заган і падвергнуць эрозіі яго маральную прыроду.Назіральнае вока паэта прыкмеціла, што багатыя людзі часта губляюць асновы чалавечнасці — міласэрнасць, спагадлівасць, любоў да бліжняга. Тыя, хто больш мае, на думку Сімяона, становяцца сквапнымі, хцівымі, зайздроснымі, чэрствымі людзьмі. З горыччу гуманіст канстатуе, што "от господ милость трудно есть стяжати" [6, *230*], бо "богачь лакомый выну собираяй, а милостыни никогда не даяй" [6, *241*]. Ды і наогул імкненне да багацця заўсёды ў гісторыі чалавецтва прыводзіла да самых згубных вынікаў. Таму С.Полацкі перасцерагае: "Желание богатства брани возбуждает" [6, *237*].

Мысліцель падкрэсліваў, што, бадай, галоўная небяспека існавання ў чалавека адмоўных якасцей заключаецца ў тым, што яны не сустракаюцца па адной, ізалявана, а часта спадарожнічаюць побач, адны нараджаюць другія і цягнуць чалавека ў балота амаральнасці: "З глупствам змешаная гардыня зайздрасць нараджае" [8, *89*].

Выкрыццю адмоўных сацыяльна-маральных якасцей педагог-паэт прысвячае верш "*Непристойная*", дзе ганьбуе такія чалавечыя рысы, як непавага да старэйшых, несправядлівасць, распуста, гордасць, зазнайства, балбатлівасць, скнарнасць, бязбожнасць, гультайства, крывадушнасць, эгаізм і інш.

Асабліва рэзкаму асуджэнню падвяргае С. Полацкі п'янства. Ён папярэджваў, што віно валодае такой шкоднай сілай, якая здольна збіваць людзей з сапраўднага шляху. "Бахус — розум сілы пазбаўляе, — пісаў ён, — у жывеліну чалавека віно ператварае" [8, *116*]. Цікава адзначыць, што, тым не менш, не само віно лічыў Сімяон разбурыцелем нораваў, а адносіны да яго чалавека. У адным з вершаў ён нават адзначаў "водку, якая людзям на карысць служыць" [8, *107*].

С.Полацкі, хоць і быў манахам, актыўна ўдзельнічаў у сацыяльна-грамадскіх працэсах, займаўся выхаваннем вучняў, таму мог даць шэраг карысных парад у арганізацыі гэтай справы. У яго творах можна выдзеліць асобныя патрабаванні, якія, на думку педагога, павінны прад'яўляцца да практычнай арганізацыі маральна-выхаваўчага працэсу. Сімяон лічыў, што сапраўдная маральнасць чалавека не можа перадавацца ў спадчыну, быць сфармаванай у выхаванцаў без апоры на іх свядомасць і пачуцці. Таму ён быў перакананы, што перадумовай маральнага выхавання павінна быць развіццё і ўдасканаленне розуму, і раіў сваім выхаванцам перад любым дзеяннем "потщися прежде оно умом разсуждати" [9, *77*]; "Разум есть прешедшая добре разсуждати, настоящая паки благоустрояти" [9, *73*]. Зыходзячы з такіх прынцыпаў, С.Полацкі велізарнае значэнне надаваў школьнай адукацыі. Ён асмеліўся даць цару прамую параду клапаціцца аб асвеце падданых: "Мало есть правды царю мудру быти, а подчиненных мудрости лишити" [9, *246*], падпарадкаванне сваіх паводзін розуму лічыў вяршыняй маральнага выхавання: "Покори плоть разуму" [7, *172*].

Як паслядоўны асветнік, С. Полацкі першараднае значэнне надаваў разумоваму развіццю, крыніцу амаль усіх бед бачыў у неадукаванасці і невуцтве. Прыхільнік асветнага абсалютызму, усюды і ва ўсім ён звяртаецца да чалавечага розуму. Імкнецца выклікаць любоў да кнігі, жаданне вучыцца, называючы кнігу крыніцай мудрасці: "Само чтение многи умудряет" [9, *247*]. Бацькі і настаўнікі павінны метадычна выхоўваць у дзецях настойлівасць і ўпартасць у авалоданні ведамі, бо "не сила капли камень пробивает, но яко часто на того падает..." [9, *74*].

Педагог верыў у неабмежаваныя магчымасці пазнання, але перасцерагаў ад павярхоўнага падыходу да вывучэння тых ці іншых рэчаў. Параўноўваючы веды, атрыманыя пры павярхоўным вывучэнні, з ягнём, а пры ўнутраным, глыбокім, — са сланом, ён заклікае вучняў пранікаць у глыбіню з'яў і "познать слона" [6, *225*]. У тэорыі і на практыцы прапагандыст і папулярызатар свецкіх ведаў С. Полацкі імкнуўся выхоўваць у дзяцей пачуццё цікаўнасці, дапытлівасці, крытычнага асэнсавання з'яў, што было смелым і прагрэсіўным узлётам думкі ў час панавання рэлігійнай схаластыкі. Ні на ёту не страціла важнасці гэтае палажэнне і ў нашы дні.

Аддаючы маральнаму выхаванню як спецыяльна арганізаванаму працэсу прыярытэтную ўвагу ў фармаванні прыстойнай асобы, С. Полацкі адзначаў, што ключавой фігурай у гэтай справе павінны быць настаўнікі-выхавацелі. Асветнік лічыў такую іх місію надзвычай важнай і высакароднай, але папярэджваў, што гэта вельмі складаная і цяжкая прафесія. У адным з яго рукапісных чарнавікоў знойдзены такі трактат аб настаўніках: "Приемли ползу от сло-

вес, отрекай же соблазн творимую делы, терзай благовонные цветы, не прикасайся будущему тернию. Собирай яко пчела мед сладкий, призерай еже неполезно, отемли пшеницу чистую, оставляя плевелы и куколы. Горе же таковым учителям, иже ино учат ино творя, уподобиша бо ся оным книжком и фарисеом, лицемером" [3, *228* адв. — *229*]. Верачы ў сілу выхаваўчага ўздзеяння на чалавека, С. Полацкі заўважае, што так, як садоўнік павінен у крывізне дрэва, як у агіднасці карціны вінаваты мастак, так і выхавальнік нясе адказнасць за "*злонравие*" дзяцей.

Сімяон бачыў у настаўніку рознабакова развітую асобу і асабліва падкрэсліваў: асноўныя недахопы ў арганізацыі маральнага выхавання на практыцы заключаюцца ў тым, што многія выхавальнікі не валодаюць тымі дабрачыннасцямі, якія спрабуюць сфармаваць у выхаванцаў. У вершы "*Учяй, а не творяй*" ён пісаў: "Мнози к добротам инех увещают, сами же онех ни мало творяют. Сии подобни суть звонам звонящим в церковь зовущим, самым не входящим" [6, *266*]. Таму мысліцель, усё жыццё якога прайшло на ніве асветы, лічыў важнейшым патрабаваннем няўхільнае прытрымліванне прынцыпу адпаведнасці слоў справам.

Важную ролю ў маральным выхаванні С. Полацкі адводзіў школе, але лічыў, што менавіта сям'я з яе укладам і традыцыямі з'яўляецца асноўным фармуючым звяном душы дзіцяці. У здаровым высокамаральным сямейным укладзе ён бачыць залог поспеху ў развіцці і станаўленні асобы дзіцяці. Вялікі педагог павучае, што плод падае блізка ад дрэва, што арол нараджае арляня, падобнае на яго. Аднак у той жа час адзначае, што ў многіх добрых бацькоў могуць быць кепскія дзеці, калі ў сям'і не займаюцца іх выхаваннем. Ён сцвярджае, што сапраўднымі бацькамі з'яўляюцца не нарадзіўшыя цела, а тыя, якія маральна сфармавалі душу дзіцяці. І калі бацькі хочуць, каб іх дзеці атрымалі добрае выхаванне, то яны не павінны шкадаваць на гэта ўласных намаганняў.

Першапраходцам з'явіўся Сімяон Полацкі і ў вызначэнні ролі маці ў выхаванні дзяцей. Да яго гэтае пытанне ў айчыннай педагогіцы як бы замоўчвалася. У патрыярхальным укладзе рускай сям'і жанчыне адводзілася роля прыслугі, паўрабыні. У стратэгічных пытаннях выхавання дзяцей яна выконвала другарадную ролю — дапамагала галаве сям'і ажыццяўляць яго стыль і метады, хаця фактычна на ёй ляжала цяжкая ноша паўсядзённага выхавання дзяцей.

Да С. Полацкага педагогі пераважна распрацоўвалі пытанні выхавання юнакоў, у яго ж поглядах прасочваецца думка аб выхаванні дзяўчат. Так, у "*Слове у день святая софья и чад ея*" ён славіць вобраз ідэальнай маці, якая выхоўвае сваіх дачок "добронравием, честностью и страхом божьим" [12, *175*].

У цэлым С. Полацкі быў прыхільнікам патрабавальных, строгіх адносін да дзяцей. Але ў той жа час ён лічыў, што маральнае выхаванне павінна будавацца на любві і павазе настаўніка да вучняў. Працэс выхавання ён раздзяляў на тры перыяды. У першыя сем гадоў раіў развіваць у дзяцей праўдзівасць, руплівасць і акуратнасць. У другую "седмицу" отрака патрэбна ўжо навучыць якому-небудзь рамяству, а ў апошні перыяд — з 14 да 21 года — юнак абавязаны ўспрыняць добры розум, страх божы і прамудрасць.

Як бачым, у адрозненне ад агульнавядомай перыядызацыі французскага педагога XVIII ст. Ж.-Ж.Русо,

распрацоўшчыка тэорыі "свабоднага выхавання", які прапаноўваў маральным выхаваннем займацца з 16 гадоў, С. Полацкі лічыў, што пачынаць гэта трэба як мага раней, "от материнской груди". У вершы "Нрав" ён пісаў, што як цяжэй перасадзіць старое дрэва ў параўнанні з маладым, так цяжэй выхоўваць больш старэйшага. Педагог адзначаў, што маральныя якасці, выхаваныя з дзяцінства, захоўваюцца на доўгае жыццё: "Нрав юноши от детсва всаженный, даже во старости бывает храненный" [6, *263*].

Вялікую ўвагу ўдзяляў С. Полацкі пытанням дакладнай, прадуманай арганізацыі маральна-выхаваўчага працэсу. Як адзначалася вышэй, мысліцель у гэтым плане засяроджваў увагу на важнасці вызначэння мэт любога віду дзейнасці. "Всякое дело совет даваряет, — пісаў ён, — ум конец его да предусмотряет" [6, *49*]. Наогул закласці добры пачатак у выхаваўчы працэс лічылася важнай перадумовай паспяховасці яго завяршэння. Затым поспех у выхаваўчай рабоце ў многім залежыць ад дакладнай паслядоўнасці яе ажыццяўлення. Педагог настойваў на сістэматычным, інтэнсіўным уздзеянні на выхаванцаў. У той жа час ён папярэджваў аб недапушчальнасці спроб штучнага паскарэння выхаваўчых вынікаў і заклікаў да разумнай паступовасці ў выхаванні: "Прежде помалу и потом во многи множестве расширатися" [4, *103*].

Каб дабіцца большай эфектыўнасці маральна-выхаваўчага працэсу, вучоны-педагог раіў імкнуцца да даступнасці, зразумеласці для выхаванцаў зместу маральнага выхавання і памкненняў настаўніка-выхавацеля. Выразна чуюцца элементы сфармуляванага ў будучым прынцыпу нагляднасці ў наступных радках вучонага : "Веру емлем тым паче, яже око видит, нежели гласом, яже ухо наше слышит" [8, *342*]. Адзначым яўна выхаваўчую скіраванасць гэтага прынцыпу, у той час як многія разглядалі яго выкарыстанне ў адукацыйных мэтах.

С.Полацкі быў найвялікшым майстрам славеснага ўздзеяння на выхаванцаў і ў сваіх пропаведзях і нораваапавучальных вершах з максімальнай прастатой, даходлівасцю і пераканаўчасцю выкладаў уласныя погляды. У процівагу складальнікам груваcткіх, шматслоўных тэкстаў Сімяон Полацкі павучаў: "Сокращенно писася, да может пояти удобнее ум и память предолго держати, ибо краткое слово удобно держится, к тщащимся пояти годнее творится" [8, *286*].

У сваіх літаратурна-педагагічных сачыненнях С.Полацкі даволі падрабязна асвятляе і метады маральнага выхавання. Наданне выключнай увагі выхаванню маральнасці на разумовых пачатках заканамерна прыводзіла яго да высновы, што будавацца гэты працэс павінен на пашырэнні асветы, у тым ліку і маральнай. Чалавечы розум Сімяон лічыў арганізатарам усіх учынкаў індывіда і параўноўваў яго з коранем, які сілкуе ўсё дрэва. Маючы за плячыма багацейшы практычны вопыт, ён меркаваў, што перш за ўсё пры выхаванні маральных якасцей неабходна выпрацоўваць у падлетка адпаведныя свядомыя адносіны да іх ці, інакш кажучы, каб дабіцца ў выхаванца прыстойных учынкаў, неабходна спачатку сфармаваць этычныя нормы паводзін у яго думках: "От добрых бо помыслов делеса благая производна бывает, от злых паки злая" [4, *74*]. Таму ён сфармуляваў пераканаўчы вывад: "Тако что сокровенно во мысли пре-

будет, то по мале во делех прявлено будет" [6, *259*].

Значнае месца ў выхаваўчым працэсе ўдзяляў С. Полацкі кнізе як важнейшай крыніцы мудрасці і дабрачыннасці. Ён падкрэсліваў, што кніга "всяких добродетелей учаше свершенства" [4, *367*], арыентаваў на ўдумлівыя свядома-крытычныя адносіны да прачытанага. Так, у трэцяй прадмове да "Псалтири рифмотворной" пісаў, што чытач павінен быць "не слов ловитель, но ума искатель" [8, *296*]. Менавіта такія адносіны да кніжнай мудрасці дапамогуць маральна-духоўнаму ўдасканаленню асобы. Мысліцель быў перакананы, што "люди злии ... книг не читати" [9, *79*], бо "книги елма ся читают, лице совести светло проявляют" [2, *4*].

Адным з крытэрыяў ацэнкі дзейснасці працэсу выхавання Сімяон лічыў фармаванне патрэбнасці самааналізу, самаацэнкі, без чаго немагчымы рух наперад, да вяршынь маральнай дасканаласці. У адным з вершаў ён пісаў: "Благо есть человеку самого ся знати, и всегда разсуждати какие в нем немощи ..." [6, *265*]. Больш таго, ён рабіў катэгарычны вывад аб тым, што калі чалавек не ведае сябе, то ён наогул нічога не ведае: "Незнаяй себе, ничего же знает, аще и звезды небесны считает" [6, *265*]. Характэрна, што ў вывучэнні чалавекам самога сябе педагог на першы план вылучаў пазнанне свайго маральнага патэнцыялу. Супрацьпастаўляючы такое самапазнанне імкненню некаторых павучаць толькі іншых, ён пісаў: "Добро есть свою совесть, не чуждую, знати, свою душу от грехов, не иных, чищати" [8, *364*].

Значную ўвагу ў сваіх тэарэтычных трактатах і практычнай дзейнасці ўдзяляў С. Полацкі метаду прыкладу. Яго нравапавучальныя творы змяшчалі вялікую колькасць узораў для пераймання з рэлігійнай сферы, свецкага жыцця і навакольнай рэчаіснасці. Слынны педагог абгрунтоўваў ідэю аб тым, што метад прыкладу мае ў сваёй аснове імкненне дзяцей да пераймання, і гэта патрэбна выкарыстоўваць у арганізацыі маральнага выхавання. Для падмацавання разважанняў аб значнасці ўласнага прыкладу выхавацеля С. Полацкі звяртаецца да аналогіі з жывой прыродай: "Арол, сваіх аперыўшыхся дзяцей заклікае да палёту, лётаючы перад імі" [8, *96*].

Асаблівы ўпор робіць С. Полацкі на тое, што для дзяцей прыкладам для пераймання павінны ў першую чаргу служыць бацькі і настаўнікі. Таму, звяртаючыся да бацькоў, ён пісаў: "Кождо учися чадо наставляти, образ и слово по себе им дати; да образ помнят, слово же читают, добродетели твоя подражают. То же вежд родший, яко твое чадо весма подобно тебе быти радо; аще благ еси, чадо блага будут, аще же ты зол, и та зла пребудут, ибо с тобою выну пребывают, что ты дееши, тому навыкают" [8, *294*]. Усё гэта ад пачатку да канца адносілася і да настаўнікаў, бо на яго "дела паче возглядают слушателие, и та подражают..." [6, *266*].

С. Полацкі справядліва заўважае, што калі мы заклікаем рабіць дабро, а самі гэтага не робім, то карысці ад такога выхавання будзе мала. У вершы "*Увещание к читателю*" ён піша: "...от детства благим деле сем учите и сами благо перед ним творите" [6, *264—265*]. Дарэчы, заклік прывучаць дзяцей рабіць добрыя справы пранізвае ўсе педагагічныя творы С.Полацкага. Яго выслоўе "Тщися ты убо все добро

творити" [6, *250*] нібы прадугадвае крылаты сёння выраз "Спяшайцеся рабіць дабро". Чалавек у разуменні Сімяона павінен жыць на карысць іншым людзям.

Дзейсным шляхам маральна-выхаваўчай работы, лічыў С.Полацкі, з'яўляецца выкарыстанне пакаранняў і заахвочванняў. Ён быў прыхільнікам строгіх правіл у выхаванні дзяцей, дапускаў выкарыстанне ў якасці выхаваўчых сродкаў фізічныя пакаранні і пісаў, што не трэба "щадить жезла" ў выхаванні дзяцей, але тым не менш зазначаў: "Благороднии чада наставляйте, от дел безчинных страхом отлучайте" [8, *295*].

Вышэй адзначалася, што выхаванне працалюбства было істотнай састаўляючай зместу маральнага выхавання, які прапаноўваўся слынным педагогам. З другога боку, С. Полацкі бліжэй за іншых яго сучаснікаў падышоў да ўразумення працы як эфектыўнага сродку маральнага выхавання дзяцей. Ён тлумачыў, што праца выкараняе ў чалавека дрэннае і сцвярджае добрае. "Юще хотяшу в себе добре угасити, — павучае педагог, — плоть трудами многими есть томити" [8, *349*]. Вось чаму ў "Обеде душевном" ён дае такую параду выхавальнікам: "Родитилие чадалюбивии, должны суть юность рожденных собою ко трудом душеполезным прекланяти, и от младых ногтей добрым делом приучати" [11, 542 адв. — 543]. Заўважым, што ўжо ў той час Сімяон робіць акцэнт менавіта на "*душеполезный труд*", а не адносіць без разбору ўсялякую працу да маральна-выхаваўчага сродку.

Філосаф-педагог даволі трапна падмеціў выхаваўчую ролю мастацтва, якое, апрача пазнавальных функцый, здольна фармаваць у чалавека добрыя норавы. Падобна Ф. Скарыне, С.Полацкі пісаў аб "душевном" уздзеянні мастацтва: "Обрящет зде юный укротителная стремлений страстей си и учасителная пламеней ярости и похоти... Обрящет зде благородный и богатый врачества недугом своим: гордости смирение, сребролюбию благорасточение, велехвалству смиренномудрие..." [9, *207*]. У цэлым выхаванне толькі тады прынясе плады, калі дзяцей будуць не толькі ўзбройваць веданнем маральных норм, але і фармаваць у іх маральныя пачуцці. На думку мысліцеля, роля эстэтыкі ў гэтым такая, што знешняя, пачуццёва ўспрымаемая чалавекам прыгажосць, якую нясе мастацтва, здольна выклікаць унутраную духоўна-маральную ўзнёсласць, абудзіць лепшыя пачуцці людзей. Ён пераканаы, што чым вышэй культура таго ці іншага чалавека, тым вышэй яго маральнасць.

У сваіх творах С. Полацкі закранаў пытанні фізічнага выхавання і ўзаемаадносін яго з маральным. Фізічнае развіццё ён лічыў асновай фармавання асобы. Аб яго ўздзеянні на разумовы стан чалавека асветнік даволі пераканаўча пісаў: "Плоти бо изнемогшей ум недобр бывает" [9, *78*]. У ідэале Сімяон бачыў гарманічнае спалучэнне фізічных, разумовых і маральных якасцей. "Ничто в мире лучше, — сцвярджаў С.Полацкі, — яко глава крепкого тела, егда умна, здрава" [9, *102*].

С.Полацкі працэс маральнага выхавання цесна ўвязваў з існаваўшай рэчаіснасцю, таму разумеў, што дзеці нярэдка будуць судакранацца і з маральнымі заганамі і злымі норавамі: "Невозможно чистым соблюстися, ибо в младенчестве си и ви-

дят, и слышат, и творят нечистоту невозбранно" [11, *543*]. Асветнік рэкамендаваў бацькам і выхавальнікам засцерагаць дзяцей ад дрэнных сяброў і арыентаваць іх "на общение с добрыми", бо "ходящий с премудрым будет сам премудр" [9, *249*].

Аднак такое ахоўванне падлеткаў не зводзілася С. Полацкім да ізаляцыі дзіцяці ад знешняга свету, як, напрыклад, у шырокавядомых падыходах знакамітага Ж.-Ж. Русо. Айчынны педагог улічваў грамадскую прыроду чалавека і разумеў, што толькі ў "содружестве жительствующий" можа стаць годным грамадзянінам. Ён лічыў, што вельмі важна навучыць дзяцей распазнаваць сапраўдных сяброў: "Познавай други в год нужды твоея" [6, *249*].

У айчыннай педагагічнай думцы трывала ўсталявалася ідэя аб тым, што адным з напрамкаў маральнага ўдасканалення асобы з'яўляецца перавыхаванне. С. Полацкі, як і Ф. Скарына, лічыў, што настаўнік-выхавацель у многім прыпадабляецца ўрачу, толькі адзін лечыць душу, а другі — плоць. "Яко врачевство болезнь исцеляет, — пісаў С. Полацкі, — философиа нрав зол душы исправляет" [6, *257*]. Аднак педагог папярэджваў, што прывіваць маральныя якасці чалавеку значна лягчэй, чым выпраўляць заганы. Таму перавыхаванне ўяўляе вельмі складаны, цяжкі і не заўсёды выніковы працэс. Гэтыя думкі ён выказаў у наступных радках:

Цяжка плацінамі перагароджваць рэкі, што бягуць
Імклівай плынню ў кірунку да горкага мора.
Аднолькава цяжка ўтрымаць злога не толькі просьбай
Ад намераў подлых, але і пагрозай строгіх законаў.
Хто затрымае з высокай вежы падаючага,
Той стрымае і імкненне да зла бягучага [8, *195*].

Пры распрацоўцы разнастайных метадаў і сродкаў маральнага выхавання С.Полацкі лічыў недапушчальным ідэалізаваць адны з іх на шкоду іншым. Вопытны даследчык чалавечага духу, ён усведамляў, што ніякі выхаваўчы сродак сам па сабе не можа быць ні добрым, ні дрэнным; разумеў, што ў залежнасці ад умоў і абставін, пры адных і тых жа падыходах, могуць быць атрыманы супрацьлеглыя вынікі. Вельмі ўдала і вобразна гэтая думка сфармулявана ў наступных радках: "Коса о камень может ся тупити, но мечь камнем может ся острити" [8, *269*].

С.Полацкі жыў і твaрыў у надзвычай складаны, пераломны перыяд гісторыі Айчыны. Пераезд у Маскву, дзе сацыяльна-палітычнае становішча было іншым, чым на Радзіме, садзейнічаў фармаванню неадназначнасці істоты вялікага асветніка, абвастрэнню многіх супярэчлівых варункаў у яго жыцці і дзейнасці. Адначасова ён быў прапагандыстам шырокай еўрапейскай адукацыі і выкаранянльнікам любой "ереси"; выхаванец езуіцкага калегіума, носьбіт ідэй базыліянскага ордэна і ў той жа час праваслаўны манах; прыхільнік асветы ўсіх людзей і абаронца элітарнасці і прывілеяванасці адукацыі, апявальнік магчымасцей, здольнасцей разняволенай асобы і прапаведнік аўтарытарызму ў выхаванні. Аднак у цэлым уклад С.Полацкага ў развіццё расійскай, ды і айчыннай педагагічнай думкі быў такім важкім, што, па ацэнцы многіх сённяшніх вучоных, ён абагнаў тагачасную ра-

сійскую рэчаіснасць на цэлае стагоддзе. І ў сучаснасці спадчына славутага палачаніна можа з поспехам выкарыстоўвацца як тэарэтычнымі распрацоўшчыкамі тэорыі маральнага выхавання, так і практычнымі арганізатарамі гэтага працэсу.

1. Антология педагогической мысли Древней Руси и Русского государства XIV—XVII вв. — М.: Педагогика, 1985. — 367 с.

2. Букварь языка словенска. — М.: Верхняя типография, 1679. — 156 л.

3. ДГМ Рукапіс № 130, л. 228—229.

4. ДГМ АР Сінод. сабр. № 287.

5. *Жуков Д., Пушкарев Л.* Русские писатели XVII века. — М.: Наука, 1972. — 284 с.

6. Из истории философской и общественно-педагогической мысли Белоруссии / Избранные произведения XVI — нач. XVII в. — Минск: Изд. АН БССР, 1962. — 524 с.

7. *Митюров Б.Н.* Развитие школы и педагогической мысли на Украине и Белоруссии (XVI—XVII вв.): Автореф. дис. ... д-ра пед. наук. — Л., 1970.

8. *Полоцкий С.* Вирши. — Минск: Мастацкая літаратура, 1990. — 447 с.

9. *Полоцкий Симеон.* Вечеря душевная. — М.: Верхняя типография, 1683. — 70 л.

10. *Полоцкий Симеон.* Избранные сочинения. — М.;Л.: Изд. АН СССР, 1953. — 282 с.

11. *Полоцкий Симеон.* Обед душевный. — М.: Верхняя типография, 1681. — 668 л.

12. *Пушкарев Л.Н.* Общественно-политическая мысль России (вторая половина XVII в.). — М.: Наука, 1982. — 288 с.

13. Хрестоматия по истории педагогики / Сост. И.Е. Лакин, М.В. Макаревич, А.Х. Рычагов. — Минск: Вышэйшая школа, 1971. — 608 с.